# Паліталогія

А.Ф.ГУЛЮК

## ПРАБЛЕМА БАЛКАНСКІХ ПЕРАСЯЛЕНЦАЎ У АЎСТРА-РАСІЙСКІХ АДНОСІНАХ У СЯРЭДЗІНЕ XVIII ст.

Пытанне аб лёсе балканскіх народаў і іх месцы ў сістэме міжнародных адносін у Еўропе і на Блізкім Усходзе з'яўлялася адным з найбольш вострых і складаных на працягу некалькіх стагоддзяў.

У XIV–XV стст. Балканскі паўвостраў амаль цалкам аказаўся пад уладай турак-асманаў. К канцу XIV ст. яны заваявалі Македонію і Балгарыю, потым Сербію, Боснію, Герцагавіну, амаль усю Грэцыю і Албанію. У канцы XV ст. фармальна была ліквідавана самастойнасць Чарнагорыі, а пасля Мохачскай бітвы 1526 г. і Дуброўнік, які знаходзіўся пад суверэнітэтам венгерскіх князёў, прызнаў над сабой вярхоўную ўладу турэцкага султана. У далейшым дзяржаўныя межы на Балканах неаднаразова змяняліся, і гэтыя змены былі даволі частымі і значнымі.

У ходзе вайны з Турцыяй у 1716–1718 гг. аўстрыйскія войскі прасунуліся далёка на поўдзень і захапілі гарады Пажарэвац, Краеву, Белград. 21 ліпеня 1718 г. быў заключаны Пажарэвацкі мірны дагавор, які замацаваў за Аўстрыяй занятыя ёй раней тэрыторыі – Малую Валахію да р.Олт, Банат, значную частку Сербіі з Белградам, частку Славоніі і Паўночную Боснію[1]. Аднак праз дваццаць год Аўстрыя, якая ўдзельнічала разам з Расіяй у вайне 1735–1739 гг. супраць Турцыі, страціла раней захопленыя ёй Паўночную Сербію і Малую Валахію. У складзе Аўстрыйскай манархіі ўсё ж засталася частка сербскіх зямель – Банат, Баранья, Срэм, Бачка.

У наступны перыяд на балканскую палітыку Аўстрыі рабілі ўплыў не толькі яе асабістыя інтарэсы і адносіны з Турцыяй, але і пазіцыя Расіі. З Расіяй Аўстрыя яшчэ з XVII ст. была звязана агульнай мэтай – супрацьстаяць асманскай экспансіі. Гэта пацвердзіла руска-аўстрыйская дэкларацыя ад 28 снежня 1739 г. аб саюзе і ўзаемнай дапамозе.

У той жа час, у перыяд аслаблення Асманскай імперыі, і Аўстрыя, і Расія імкнуліся ўзмацніць свой уплыў і пранікненне на Балканскі паўвостраў. Аўстрыйскія Габсбургі лічылі Балканы зонай свайго ўплыву і адмоўна ставіліся да прасоўвання Расіі к вусцю Дуная і ўмацаванню яе пазіцый у гэтым рэгіёне[2].

У выніку складаных перамоў у 1746 г. Расія і Аўстрыя ўсё ж такі падпісалі саюзны дагавор. У «сакрэтнейшым артыкуле аб Атаманскай Порце» яны гарантавалі ўзаемную падтрымку тэрмінам на 25 год у тым выпадку, калі Асманская імперыя паспрабуе парушыць статус, створаны ў Паўднёва-Усходняй Еўропе Белградскім мірам 1739 г. У 1753 г. дзве дзяржавы зноў вярнуліся да «сакрэтнейшага артыкула» і пацвердзілі яго значэнне на вечныя часы[3].

Нягледзячы на руска-аўстрыйскія супярэчнасці на Балканах у сярэдзіне XVIII ст., адзінства пазіцый у адносінах да Асманскай імперыі яшчэ было

патрэбна і Вене, і Пецярбургу. З боку Аўстрыі гэта падмацоўвалася і яе імкненнем набыць падтрымку Расіі супраць антыаўстрыйскага блока Францыі і Прусіі.

Пасля ўступлення на расійскі прастол Елізаветы Пятроўны ў 1741 г. знешнюю палітыку краіны ўзяў у свае рукі канцлер А.П. Бястужаў-Румін. У аснову сваёй палітычнай сістэмы ён паклаў саюз Расіі з Аўстрыяй. Мэтай саюза было імкненне супрацьстаяць узрастаючай магутнасці Прусіі і пачаць наступленне на Турцыю. Значную ролю ў руска-аўстрыйскіх адносінах па-ранейшаму адыгрывала балканскае пытанне і як яго састаўная частка – праблема перасялення ў Расію выхадцаў з Балканскага паўвострава. Яна мела значны ўплыў на характар узаемаадносін Расіі і Аўстрыі.

У канцы XVII ст. у аўстрыйскіх уладаннях пражывалі дзесяткі тысяч сербаў. Яны складалі асноўную частку насельніцтва паўднёва-славянскіх зямель, якія ўваходзілі ў імперыю аўстрыйскіх Габсбургаў. Многія сербы апынуліся на тэрыторыі Аўстрыі ў выніку міграцыйных працэсаў, якія часцей за ўсё былі выкліканы ўдзелам насельніцтва балканскіх правінцый Асманскай імперыі ў войнах на баку праціўнікаў Турцыі. Аўстрыйскія ўлады размяшчалі перасяленцаў у памежных з Асманскай імперыяй раёнах і залічвалі іх у асобныя палкі, якія ахоўвалі мяжу. Жыхары памежных раёнаў называліся гранічарамі і з'яўляліся своеасаблівай праслойкай, якая звязвала праваслаўнае насельніцтва Асманскай і Аўстрыйскай імперый[4]. Аднак голад, высокая смяротнасць, прыгнёт Габсбургаў і каталіцкай царквы прымушалі славянскае насельніцтва пакідаць Аўстрыю і перасяляцца ў Расію. У Пецярбургу лічылі гэта зручным момантам для прыцягнення тысяч каланістаў і павялічвання колькасці сваіх войскаў на паўднёвых межах дзяржавы. Вялізная і дрэнна ахаваная з поўдня Расія мела патрэбу ў перасяленцах. Да таго ж сербы былі блізкімі да рускіх па мове і звычаях і лічыліся добрымі воінамі. Палітыка Расіі ў перасяленчым руху садзейнічала павышэнню яе прэстыжу ў вачах балканскіх народаў і ўмацаванню пазіцый царызму на Балканах.

Прапанова аб вярбоўцы і перасяленню ў Расію некалькіх тысяч славян з аўстрыйскіх уладанняў паступіла рускаму паслу ў Вене М.П.Бястужаву-Руміну ад сербаў І.Харвата, Р.Прэрадавіча, І.Шэвіча, палкоўнікаў аўстрыйскай арміі. У адказ на гэту прапанову 24 снежня 1751 г. быў выдадзены ўказ расійскай імператрыцы Елізаветы Пятроўны, які прадпісваў Сенату і ваеннай калегіі вызначыць раёны пасялення паўднёвых славян. Згодна з указам, перасяленцам павінны былі быць дадзены «выгадныя месцы і патрэбныя на будоўлю матэрыялы», каб потым «яны ўжо самі ад сваёй эканоміі забяспечваліся б і мундзірамі, і канямі, і іншым»[5]. Пазней, 11 студзеня 1752 г., было прынята рашэнне аб утварэнні двух паўднёваславянскіх паселішчаў – Новай Сербіі і Славяна-Сербіі і вызначаны асновы ваеннай арганізацыі пасяленцаў.

Акрамя сербаў, якія пражывалі ў Аўстрыі, у Расію перасяляліся жыхары Асманскай імперыі: далмацінцы, малдаване, валахі і інш. З 1752 па 1762 г. у Новай Сербіі і Славяна-Сербіі пасялілася каля 25 тысяч чалавек[6].

Між тым «сербская справа», як называлі тады пытанне аб перасяленні выхадцаў з Балканскага паўвострава ў Расію, выклікала значныя ўскладненні ў руска-аўстрыйскіх адносінах. Рускі пасол у Вене М.П.Бястужаў-Румін спрабаваў пераканаць аўстрыйскую імператрыцу Марыю-Тэрэзію, што інтарэсы абедзвюх дзяржаў да таго блізкія, што не мае ніякага значэння, ці застануцца сербы ў Аўстрыі, ці пераселяцца ў Расію. Калі ж венскі двор не адпусціць сербаў у Расію, то яны могуць пайсці ў Асманскую імперыю, а гэта непажадана як для Аўстрыі, так і для Расіі[7].

Аўстрыйскія ўлады тым не менш былі занепакоены перасяленчым рухам. Марыя-Тэрэзія не чакала, што ў яе ўладаннях знойдзецца так шмат сербаў,

якія жадаюць змяніць аўстрыйскае падданства на рускае, і што Расія пачне так горача садзейнічаць ім. 29 мая 1752 г. М.П.Бястужаў-Румін паведаміў у Пецярбург, што Марыя-Тэрэзія забараніла сербам выдачу пашпартоў, а на межах з Польшчай і Трансільваніяй, праз якія перасяленцы ішлі ў Расію, былі створаны фарпасты[8]. Аўстрыя адкрыта заяўляла аб нежаданні страчваць частку свайго насельніцтва нават на карысць такога неабходнага саюзніка. Расія не здолела пераканаць венскі двор у тым, што Аўстрыя ў гэтым выпадку нічога не страчвала. У той час і Аўстрыя, і Расія лічылі выгадным павялічванне свайго насельніцтва.

Аўстрыйскі пасланнік у Пецярбургу барон Прэтлак прызнаў, што венскі двор дазволіў выдачу пашпартоў нязначнай колькасці сербаў толькі каб пазбавіцца ад «неспакойных і няўрымслівых людзей». Меркавалася адпусціць у Расію ад 500 да 1000 чалавек, а на самой справе выехала каля 2000. Прэтлак заявіў, што Аўстрыя спадзявалася на сяброўскія адносіны з боку Расіі, аднак рускі ўрад не спраўдзіў гэтых спадзяванняў[9]. Рускі канцлер А.П.Бястужаў паведаміў у Вену, што калі Аўстрыя пагадзіцца на перасяленне паўднёваславян у Расію, усялякія спрэчкі з гэтай прычыны будуць спынены і аўстрыйскаму двару будзе выказана належная ўдзячнасць.

Марыя-Тэрэзія не паддавалася, сітуацыя абвастралася. Канцлер А.П.Бястужаў паслаў у Вену замест свайго брата новага пасла – графа Карла Кайзерлінга і загадаў яму дзейнічаць больш абачліва і асцярожна. У сваю чаргу Сенат і Калегія замежных спраў разгледзелі «сербскую справу» і прынялі рашэнне не адмаўляцца ад прыцягвання ў Расію аўстрыйскіх падданых, пры гэтым спасылаліся на першапачатковае спрыяльнае стаўленне да гэтага Марыі-Тэрэзіі і на тое, што сама Аўстрыя зацікаўлена, каб сербы ехалі ў Расію, а не ў Асманскую імперыю. «Сербская справа» не змагла расстроіць саюз паміж Расіяй і Аўстрыяй, які быў заключаны ў 1746 г. Пагрозы з боку Прусіі і Францыі вымушалі Вену і Пецярбург трымацца разам і не даходзіць да крайнасці ў праяве ўзаемнай незадаволенасці, выкліканай перасяленчым рухам.

У гэты час у Пецярбургу надавалі вялікае значэнне і перасяленню насельніцтва балканскіх правінцый Асманскай імперыі. Аднак расійскія ўлады вырашылі не пачынаць перамоў з Турцыяй аб афіцыяльным дазволе яе падданым ехаць у Расію, таму што турэцкі ўрад адхіліў бы гэту прапанову. І Расія была вымушана праводзіць перасяленне без агалоскі, непрыметна і асцярожна.

У пачатку 50-х гадоў XVIII ст. у Расію адправіўся чарнагорскі мітрапаліт Васіль Петравіч, упаўнаважаны «чарнагорскімі начальнікамі і ўсім чарнагорскім грамадствам» прасіць у рускага ўрада дапамогі і абароны ад турак і венецыян[10].

Васіль Петравіч таксама прасіў у Расійскай імператрыцы пабудаваць у Чарнагорыі славянскія школы, пры гэтым ён спасылаўся на тое, што чарнагорскі «народ хаця і мужны, але не мае навучання школьнага», для чаго не мае сродкаў. Ён прасіў таксама паслаць чарнагорцам «узнагароду»; «рэкамендаваць» Чарнагорыю Аўстрыі і Венецыі; дазволіць чарнагорцам выезд у Расію; вызначыць суму грошай «на воінскае забеспячэнне»; прыняць Чарнагорыю ў рускае падданства[11].

8 сакавіка 1754 г. Елізавета Пятроўна зацвердзіла запіску, у якой змяшчаўся адказ на просьбы Васіля Петравіча. Пытанне аб стварэнні ў Чарнагорыі славянскіх школ адкладвалася да тых пор, пакуль Расія не атрымае дадатковыя звесткі аб суме грошай, якая неабходна для адкрыцця гэтых школ. «Узнагарода» чарнагорцам і грошы на аднаўленне цэркваў, усяго 5000 руб., былі выдзелены і перададзены Васілю Петравічу. Больш складана было з просьбамі чарнагорцаў наконт Аўстрыі і Венецыі. Ім было толькі абяцана

«прыстойнае дамаганне». Яшчэ больш складана было абараніць чарнагорцаў ад турак. Рускі ўрад абяцаў заўсёды гэта браць пад увагу і калі што, «пры Порце Атаманскай заступленне ўчыніць»[12]. Пытанне аб перасяленні чарнагорцаў у Расію было вырашана станоўча. За ўдзел у вайсковых дзеяннях супраць турак у кожным асобным выпадку было вырашана пасылаць чарнагорцам «узнагароду». На просьбу прыняцця іх пад абарону Расіі мітрапаліту адказалі, што неабходна атрымаць «фармальнае прашэнне» чарнагорскага народа.

Масавае перасяленне чарнагорцаў у Расію выклікала б рашучы пратэст з боку Порты, таму было вырашана праводзіць перасяленцаў таемна і невялікімі партыямі. Аднак складанасці ўсё ж такі ўзніклі. Вясной 1754 г. Аўстрыя адмовілася прапусціць чарнагорцаў праз сваю тэрыторыю. Карл Кайзерлінг дабіваўся дазволу на пропуск чарнагорцаў у Расію. Пасол імкнуўся даказаць, што яны «вольныя людзі», якія не толькі не прызнаюць вярхоўнай улады Порты і не плацяць ёй дані, але і знаходзяцца ў пастаяннай барацьбе з туркамі[13]. Ён звярнуўся да Карэра, венецыянскага пасла ў Вене. Адказ быў тым жа: чарнагорцы – турэцкія падданыя, і, калі Порта пагадзіцца, Венецыя ў знак пашаны да расійскага двара дазволіць прапусціць чарнагорцаў у Расію праз сваі ўладанні. Нарэшце, праз некалькі месяцаў з вялікім нежаданнем Аўстрыя ўступіла Расіі і прапусціла праз сваю тэрыторыю перасяленцаў з Балканскага паўвострава[14].

Месцы для іх паселішча былі вызначаны ў Арэнбургскай губерні, за ракой Самарай. Там разлічвалі пасяліць чарнагорцаў, албанцаў, і чакалі з Еўропы «людства немалае». Між тым адны перасяленцы пажадалі служыць у рэгулярным войску, другія – перайсці ў Новую Сербію. І ў выніку, да 1759 г. на месцы новага паселішча нікога з іх не засталося.

Хутка бурлівыя ваенныя і дыпламатычныя падзеі ў Еўропе адцягнулі ўвагу Расіі ад праблем, звязаных з балканскім перасяленчым рухам. Расія далучылася да аўстра-французскага блока і ўступіла ў Сямігадовую вайну (1756–1763).

Адносіны паміж Расіяй і Аўстрыяй у сярэдзіне XVIII ст. сведчылі аб значнай ролі балканскага фактару ў палітыцы гэтых дзяржаў. Заваяваныя Турцыяй народы Балканскага паўвострава ўзмацнілі барацьбу за сваю незалежнасць. Адным са сродкаў супраціўлення турэцкаму панаванню былі ўцёкі паўднёваславян у іншыя краіны, перш за ўсё ў Аўстрыю, а затым – іх перасяленне ў Расію. І Расія, і Аўстрыя імкнуліся ўзмацніць свой уплыў на балканскія народы і заручыцца іх падтрымкай на выпадак вайны з Асманскай імперыяй. Неаднаразовыя заявы аб гатоўнасці аказаць дапамогу вызваленчай барацьбе прыгнечаных народаў Асманскай імперыі, якія маскіравалі экспансіяніцкія імкненні Аўстрыі і Расіі, тым не менш знаходзілі водгук ў іх асяроддзі і падтрымлівалі надзею на вызваленне і незалежнае развіццё.

[1] Полтавский М.А. История Австрии. Пути государственного и национального развития. М., 1992. Ч.1. С.177.

[2] Виноградов В.Н. // Новая и новейшая история. 1996. №4. С.51.

[3] Михнева Р. Россия и Османская империя в международных отношениях в середине XVIII в. М., 1985. С.125.

[4] Грачёв В.П. Балканские владения Османской империи на рубеже 18–19 вв. М., 1990. С.16.

[5] Архив внешней политики Российской империи (далее – АВПРИ). Ф.: Сношения России с Сербией, Болгарией, Славонией, 1751–1752 гг., д.2-а, л.38об.

[6] Бажова А.П. Русско-югославские отношения во второй половине XVIII века. М., 1982. С.85.

[7] АВПРИ. Д.3, л.9-12об, 16-21об.

[8] Там жа. Д.3, л.39-42об.

[9] Записки Одесского общества истории и древностей. Одесса, 1860. Т.4. С.355 і наст.

[10] АВПРИ. Д.7, л.22-22об.

[11] Там жа. Л.16-16об, 44-45, 50-50об.

[12] Там жа. Л.48-51об, 52-55.

[13] Соловьев С.М. История России с древнейших времен. М., 1964. Кн.12. С.215.

[14] АВПРИ. Д.7, л.91-94об.